СЛОВА СВАЯМОЎНАЕ, АДМЫСЛОВАЕ, ГАВАРКОЕ…

Алесь Каўрус… Імя гэтага таленавітага даследчыка роднай мовы карыстаецца заслужанай павагаю сярод тых, хто шануе і любіць беларускую мову, якая вылучаецца сярод іншых славянскіх моў сваім непаўторным лексічным багаццем і адмысловай мілагучнасцю.

Пра вынік плённай працы вучонага гавораць самі за сябе кнігі, у якіх асноўным аб'ектам даследавання з'яўляецца роднае слова, яго ўжыванне і ўтварэнне: "З крыніц народнай мовы" (1968), "Стылістыка беларускай мовы" (1980, 3-е выд. 1992), "Культура слова" (1983), "Слова наша роднае" (1986), "Мова народа, мова пісьменніка" (1989). А. Каўрус упершыню ў беларускім мовазнаўстве стварыў даведнік "Дакумент па-беларуску" (1994), арыентаваны на шырокага чытача: справавода і бухгалтара, прадпрымальніка і спажыўца, вучня і настаўніка, студэнта і выкладчыка, журналіста і выдаўца. Неацэнную каштоўнасць мае "Руска-беларускі слоўнік", у якім падаюцца не толькі растлумачаныя ў папярэдніх раздзелах словы, але і некаторыя іншыя, што выклікаюць пэўную цяжкасць пры ўжыванні, асабліва пры перакладзе з рускай мовы на беларускую.

А колькі артыкулаў, рэцэнзій змешчана гэтым руплівым даследчыкам у часопісах "Полымя", "Маладосць", "Роднае слова", "Беларусь", а таксама ў газетах, у тым ліку ў "Звяздзе", "ЛіМе", "Нашым слове"! Навуковец карпатліва даследуе слова, паказвае яго непаўторнасць, самабытнасць, засцерагае чытача ад няўдалага ўжывання неўласцівых беларускай мове формаў слоў, сінтаксічных канструкцый. Матэрыялы і вынікі назіранняў А. Каўруса над моўнай практыкай (пачатак 1960-х гг. і да нашага часу) змешчаны ў кнізе "Да свайго слова: пытанні культуры мовы" (2010), якая атрымала высокую ацэнку ў рэцэнзіях і водгуках спецыялістаў-мовазнаўцаў.

Цягам некалькіх гадоў (1998-2005) А. Каўрус выступаў на старонках часопіса "Роднае слова" з публікацыяй "пазаслоўнікавай" лексікі - слоў, не змешчаных у пяцітомным "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (1977-1984). І вось гэтыя "бяздомныя" словы нарэшце знайшлі надзейны прытулак - змешчаны ў кнізе А. Каўруса **"Скловаклад: слоўнік адметнай лексікі"**, якая ў гэтым годзе выйшла накладам 700 асобнікаў у Выдавецкім доме "Звязда". За час які мінуў пасля "роднасловаўскай" публікацыі, некаторыя словы, як адзначаецца ў "Прадмове", атрымалі "прапіску" - увайшлі ў найноўшыя слоўнікі. Гэта тлумачыцца тым, што "пазаслоўнікавыя" словы, па-першае, арыгінальныя паводле марфемнай будовы, а па-другое, запатрабаваны моўнай практыкай як сродак намінацыі. Да такіх слоў можна аднесці *аповед, асобнік, выбітны, выканаўца, гасцёўня, дамова, досвед, заўзятар, звяз, летнік* (летні аздараўленчы лагер для дзяцей), *навуковец, назоў, напоўніцу, насамрэч, наступства, падліковец, падпісант, паняццевы, перамовы, складнік, сумнеў, унёсак*… Дарэчы, гэтыя словы ўключаны ў такі аўтарытэтны даведнік, як "Слоўнік беларускай мовы" (Мінск: Беларуская навука, 2012), навуковымі рэдактарамі якога з'яўляюцца дактары філалагічных навук А.А. Лукашанец і В.П. Русак.

Як вынікае з анатацыі, у слоўніку даецца тлумачэнне больш як трох тысяч слоў, даўніх і тых, што ўзніклі ў наш час, якія ўжываюцца ў мастацкіх і навуковых тэкстах, у мове сродкаў масавай інфармацыі.

Актуальнасць Слоўніка тлумачыцца ў "Прадмове": "на фоне мноства неалагізмаў, якія амаль штодня прыходзяць у беларускую мову з іншых (пераважна з англійскай) і хутка пашыраюцца, усё большую цану набывае выяўленне і папулярызацыя ўласна беларускіх слоў - даўніх і тых, што ўзнікаюць у наш час" (с. 3). У прыватнасці, у слоўніку падаюцца прыметнікі і назоўнікі, якім у рускай мове адпавядаюць дзеепрыметнікавыя формы з суфіксамі ***-ущ-, -ющ-, -ащ-, -ящ-, -ем-, -им-, -вш-, -ш-***. Напрыклад: *абагульняльны* (рус. обобщающий), *аб'ядноўчы* (объединяемый), *гнятлівы, прыгнётлівы* (гнетущий), *накіроўчы* (направляющий), *моўца, размоўца* (говорящий), *атакоўны* (атакующий), *разгледаны* (рассматриваемый), *адбыты* (состоявшийся), *расмяяны* (рассмеявшийся), *ранлівы* (ранимый), *задрыжэлы* (задрожавший). Шэраг назоўнікаў (у тым ліку наватворы) з тыповымі для беларуская мовы суфіксамі ў ролі адпаведнікаў рускіх дзеепрыметнікаў з названымі вышэй суфіксамі пашыраецца ва ўжытку, пра што сведчыць Слоўнік: *выступоўца (выступовец, выступальнік, выступальшчык, выступанец), завітанец, нападнік (нападчык, нападоўца), правяральнік, спадзяванец, спачувальнік, спрыяльнік* ды інш.

Слоўнікавыя артыкулы распрацаваны і афармлены паводле тлумачальнага слоўніка. Яны ўключаюць наступныя элементы.

Загалоўкавае (рэестравае) слова: размяшчаецца ў алфавітным парадку, пры ім падаюцца варыянты, дублеты і (зрэдку) сінонімы. Напрыклад:

АДПАЧЫВАЛЬНІК, АДПАЧЫНШЧЫК, АДПАЧЫННІК, -а, АДПАЧНІК, -а, АДПАЧЫВАНЕЦ, -нца, *м*.

Граматычная характарыстыка слова: ужываюцца паметы часцін мовы (напрыклад, *прысл.*); роду (*м., ж., н.*), трывання (*незак., зак.*) і інш.; паказваюцца граматычныя формы роднага склону назоўнікаў у адзіночным ліку, а пры патрэбе - і іншых склонаў; формы 1-й, 2-й, 3-й асобы адзіночнага ліку. Напрыклад:

ДОСВЕД, у, *м*.

ДАСКАНАЛІЦЬ, -лю, -ліш, -ліць; *незак*.

ПРОМНЕВЫ, -ая, -ае.

ПЕРАМОВЫ, -аў; *адз. няма*.

КАЛАСАВІНЫ, -аў, -він; *адз. няма*.

ПРОПЛАЧ, *прысл.*

Сэнсавая характарыстыка - гэта раскрыццё значэнняў слова і ягоных сэнсавых адценняў. Асноўныя спосабы раскрыцця значэння слоў - шляхам тлумачэння (лагічнага вызначэння сэнсу слова) або праз агульнаўжывальнае, каардынуючае слова, праз сінонімы, праз дыфікаванае слова - адно ці некалькі. Значэнне слова можа тлумачыцца ўстанаўленнем словаўтваральных адносінаў вытворнага слова з тым, ад якога яно ўтворана. Напрыклад:

ПРАЦАЛЮБ, -а, *м*. Той, хто любіць працу; шчыры працаўнік.

РАСПАЎСЮДНІК, -а, *м*. Распаўсюджвальнік.

КРЭСЕЛКА, -а, *н. Памяньш.-ласк.* да крэсла; крэсельца.

АЎТАРКА, -і, *ж. Жан. да* аўтар.

Ілюстрацыйны матэрыял - цытаты з літаратурных крыніц. Ілюстрацыі дапамагаюць больш дакладна раскрыць сэнс слова, паказаць яго сферу ўжывання і спалучальнасць. Напрыклад:

ДОБРА, *у знач. наз., нескл., н.* У выразе: даць добра - даць згоду, дазвол. *Ураду трэба не проста даць **"добра"** на існаванне фермерства, а выпрацаваць пэўную праграму яго абароны, заахвочвання, падтрымкі* (Звязда. 12.09. 1992).

ПЕРАДУСІМ, *прысл*. Перш за ўсё, найперш. *Перадусім патрэбны чалавечыя ўзаемаадносіны - без іх нічога не атрымаецца* (ЛіМ. 31.10. 1997).

Націск у словах, за рэдкім выключэннем, не ставіцца. Гэта тлумачыцца неабходнасцю пазбегнуць недакладнай акцэнталагічнай характарыстыкі рэестравых слоў, частка з якіх індывідуальна-аўтарскія, рэдкаўжывальныя. Выключэнне складаюць адзінкавыя выпадкі, калі адсутнасць значка націску можа ўскладніць адэкватнае ўспрыманне слова. Напрыклад:

ДЗЯЯЧ, дзеяч**а**, *м*. Дзеяч. *Першым рэктарам* [Полацкага езуіцкага калегіума] *стаў славуты царкоўны і палітычны **дзяяч** Рэчы Паспалітай Пётра Скарга* (У. Арлоў).

ПАСЫПА**Н**Ы, -ая, -ае. Які пасып**а**ўся, пасыпаецца *чым-н. Прад ганкам пляцок **пасыпаны** Пясочкам адборным жаўцеў* (М. Грамыка).

Значэнні шматзначнага слова адасабляюцца адно ад аднаго ў межах артыкула арабскімі лічбамі. Напрыклад:

ЧЫТВО, -а, *н*. 1. Тое, што чытаюць; тэкст, які чытаюць; чытанне. *Апынуўся на сёння зусім без чытва, успомніў, што ў адным з апошніх нумароў "Звязды" прайшоў міма даволі вялікага апавядання, таксама і ў апошнім "ЛіМе"* (Я. Брыль).

2. Пра твор мастацкай літаратуры, які мае займальны змест, але не вызначаецца высокімі мастацкімі вартасцямі; чытаніна. [А. Глобус:] *Я ведаю, што такое на сённяшні дзень літаратура, што прадаецца і чытаецца. Што такое кан'юнктура, бульварнае **чытво**, якім яно павінна быць антыінтэлектуальным* (ЛіМ. 24.04. 1998).

Амонімы падаюцца асобна як загалоўкавыя словы з лічбавымі паказчыкамі ўверсе справа. Напрыклад:

НАБОЖНІК[1], -а, *м*. Ручнік, як вешаецца над абразамі. *Часам трохі схаваецца* [месік] *за правідную болачку, што тонкімі фарботамі расцягнецца па ім, як вышываны ўсякаю гурынаю паркалёвы набожнік над абразом у святым хатнім куце* (М. Гарэцкі).

НАБОЖНІК[2], -а, *м*. Тое, што і набажэнец [той, хто верыць у Бога і выконвае рэлігійныя абрады]. [Звон] *будзе, зліўшыся з вячэрнім хорам, Набожнікаў у цэркву звяць* (ЛіМ. 23.07.1971).

Шматкроп'е (…) перад дэфініцыяй асобных слоў сігналізуе, што разглядаецца толькі значэнне, не зафіксаванае ТСБМ. Напрыклад:

ДАРАДЦА, -ы, *м*. …Саветнік. *Хутчэй за ўсё* [былы рэктар] *будзе працаваць дарадцам у Міністэрстве адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь* (Звязда. 20.01.1996).

АБВАЛЕНЫ, -ая, -ае. …Які абваліўся. *Гарэла абваленая столь* (В. Адамчык).

МУЗЫЧНЫ, -ая, -ае. …Музыкальны. - *Мне не трэба шмат гаварыць, я бачу, што ты ацаніў мае сціплыя музычныя здольнасці, - сказала Вераніка* (У. Рубанаў).

Як натуральныя ўспрымаюцца зафіксаваныя ў Слоўніку формы найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў, утвораныя далучэннем прыстаўкі ***най-*** да пачатковай формы прыметніка, напрыклад *найсветлы - найсвятлейшы*: *Бывала, калі ўсе зараз паспеюць* [яблыкі] *І шпокаць, спелыя, пачнуць на грады - Звон залаты стаіць на ўсю краіну. Пачуў яго, той звон, і цар найсветлы* (Я. Сіпакоў). Таму меркаванне некаторых навукоўцаў, што такія формы нібыта чужародныя беларускай мове, нічым не апраўданае.

Замест слоў з нехарактэрным для беларускай мовы суфіксам ***-цель*** у Слоўніку ўжываюцца натуральныя адпаведнікі, напрыклад *глушыльнік* - глушыцель: *Гучнагаварыцелі не могуць "перашумець" некалькі дзясяткаў магутных маторaў са знятымі глушыльнікамі* (Чырвоная змена. 15.07.1975), *засядальнік* - засядацель: *Гэтыя людзі выбралі сваіх засядальнікаў у суд* (К. Чорны), *натхняльнік* - натхніцель: *У момант пуску станцыі я стаяў на пульце кіравання побач з Ігарам Васільевічам Курчатавым - палымяным энтузіястам і натхняльнікам будоўлі* (Маладосць. 1972. № 4).

Сярод зафіксаваных ёсць і такія словы, якія называюць паняцці, што ў літаратурнай мове не маюць аднаслоўнікаў. Напрыклад: *абуджэнец* - той, хто абуджае *ў каго-н*. нацыянальную свядомасць, годнасць: *"Абуджэнец" - назва артыкула В. Рагойшы, прысвечанага Сяргею Палуяну* (Звязда. 26.04.1997), *адважнік* - адважны чалавек: *Пакуль ёсць адважнікі, будуць і баязліўцы, пакуль ёсць баязліўцы - будуць і адважнікі* (Н. Мацяш), *выраканец* - той, хто выракся свайго роднага: *І памяць кроснy сноу, І лесуны барукаюцца. Шляхі разышліся яе З бязроднымі выраканцамі* (Р. Барадулін), *дабрэнны* - вельмі добры: *Саладоўні і мядоўні, тут жа, за два крокі ад карчмы. выраблялі дабрэнны напітак* (К. Чорны). [Агапа:] *Вунь у іншых і без бацькі, а такія ж дабрэнныя павырасталі*… (Б. Сачанка). Таксама: *адмыслоўца* (ЛіМ. 6.03.1998) - той, хто валодае выдатным майстэрствам, *аднакамернік* (Г. Далідовіч) - той, хто знаходзіцца з кім-н. у адной камеры, *аднапалатнік* (В. Хомчанка) - той, хто знаходзіцца з кім-н. у адной палаце, *асцярожнік* (Ф. Янкоўскі) - пра чалавека, які дзейнічае з аглядкай, з асцярогай, *багаўслаўны* (Р. Барадулін) - прызначаны ўслаўляць, славіць Бога, *беларускасць* (З. Цехановіч) - сукупнасць характэрных прыкмет беларускага, *беларушчына* (Наша слова. 18.02.1998) - спрадвечная мова, культура, звычаі, традыцыі беларусаў, *вывучальнік* (К. Чорны) - той, хто вывучае каго-н., што-н., *жальбіны* (ЛіМ. 26.06.1998) - дзень памяці каго-н., *застольнік* (В. Казько) - удзельнік застолля, *лідэрны* (Беларускае радыё. 5.09.1993) - які з'яўляецца лідэрам, першым у чым-н., займае галоўнае становішча, *мурзач* (В. Гардзей) - запэцканы, брудны чалавек, *непатрэбіца* (С. Мінскевіч) - непатрэбная рэч і многія іншыя.

Некаторыя словы захавалі марфемную будову асновы, ад якой яны ўтвораны, інакш кажучы - без чаргавання апошняга зычнага гэтай асновы. Напрыклад: *журбаваць, журбоіцца* - журыцца, сумаваць: *Не журбуйце ж, тата, маці! Буду вас яшчэ вітаці, як з вайны здароў вярнуся* (Я. Купала). *Недзе зараз у сціпанай хаце Пра мяне журбоіцца маці* (С. Законнікаў). Таксама: *жулікаванне* (Ю. Віцьбіч) - жульніцтва, *запросіны* (М. Танк) - запрашэнне, *начлегаваць* (В. Ластоўскі) - начлежнічаць, *праракаваць* (А. Арочка) - прарочыць, *снегавінка* (А. Гарун) - сняжынка і г.д.

У Слоўніку мы сустрэнемся з тыповымі для беларусаў сваімоўнымі формамі ветлівага і афіцыйнага звароту да грамадзян сваёй краіны. Гэта формы *спадар*: *Віншуем Міколу Іванавіча з юбілеем! Так і надалей, **спадар** Ермаловіч!* (ЛіМ. 3.05.1991), *спадарыня* - *жан. да* спадар: *Вядома, яна пакахала яго ад самага пачатку: пакахала свой адбітак не ў раўнадушным шкле, як таго патрабавала **спадарыня** Хей, а ў Сярожавых уважлівых вачах* (Полымя. 2003. № 6), *спадарства* - спадары: *Запрашаю, **спадарства**, заглянуць у жытло сучаснага выкладчыка інстытута* (ЛіМ. 1.11.1991). Ёсць і прыметнік, утвораны ад *спадар* - ***спадар***оўскі: *Мова яго* [К. Дужа-Душэўскага] *перакладаў была без ніякіх **спадароўскіх** дзівосаў - жывая, зразумелая, народная* (М. Танк). Пра гэтыя спрадвечнабеларускія словы Р. Барадулін казаў: "Яны абсалютна арганічныя! Сваёй даўніной, паважлівым гучаннем проста цешаць слых!" Нельга не пагадзіцца з прафесарам І. Лепешавым, што "па сутнасці, сёння слова *спадар* - адзіная форма ветлівасці і афіцыйнага звароту ці ўпамінання - пры прозвішчы, імені або званні асобы". Дарэчы, у акадэмічным "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (1996) ёсць цэлае гняздо з коранем ***спадар-*** (спадар, *спадарыня, спадарства*). На жаль, у згаданым "Слоўніку беларускай мовы" чамусьці "не хапіла" месца гэтым самабытным і так патрэбным ва ўзаемінах словам.

У навуковых працах пры адсылцы да іншых цытаваных раней навуковых крыніц выкарыстоўваецца трапнае, ёмістае слова - прыслоўе *тамсама* ('у тым самым месцы'): *Дзён праз чатыры ўбачыў яго тамсама трэці раз* (У. Мехаў). Паводле гэтай словаўтваральнай мадэлі ўтворана і прыслоўе *тутсама* ('у гэтым самым месцы'), якога так не ставала дагэтуль моўнай практыцы: ***Тутсама** ў слоўнікавым артыкуле чытаем і наступнае*… (Роднае слова. 1997. № 12). ***Тутсама** ў дварэ пункт прыёму шклатары* (Наша ніва 17.05.1999).

Паводле "Беларускай граматыкі" (1985) дзеепрыметнікі залежнага стану не ўтвараюцца ад пераходных дзеясловаў незакончанага трывання з суфіксамі ***-іва-, -ва-*** Аднак моўная практыка пацвярджае ўжыванне такіх дзеепрыметнікавых формаў. Напрыклад: *абліваны* - які аблівaўся, аблiваецца чым-н.: *Злітае потам, слязьмі аблiванае, Дзікае зелле прыносіш ты* [поле] *нам* (Я. Купала), *паліваны* - якія паліваецца чым-н.: *Вось, як гляну, гляну я На жыццё паганае, Бачу ўсё мне знанае, Слязьмі паліванае* (Я. Купала), *ужываны* - …які ўжывалі, ужываюць: *Далей яна патлумачыла асаблівасці ўжываных у сферы адукацыі нарматыўных актаў, якія патрабуюць для фармавання школьнага класа мінімальнай колькасці заяў бацькоў* (Наша слова. 19.12.1996).

Многія з ужытых у Слоўніку слоў не зусім рэдкія ў моўнай практыцы. Падамо, услед за Іванам Лепешавым і Лявонам Баршчэўскім, некаторыя з іх: *дасканаліць* (тое, што і ўдасканальваць), *замежнік* ('іншаземец, іншакраінец'), *землятрус*, *напрыканцы, паспаліты* ('звычайны, просты'), *прылюдны, смутлівы, сураз-моўца, хваласпеў, хмарачос*…

Замест назоўніка *мсціве́ц* (з цяжкавымоўным збегам пачатковых зычных, першы з якіх санорны) у Слоўніку падаецца *помснік*, вытвор ад асновы сваімоўнага дзеяслова *помсціць*: *- Ну што ж? астаўвайся, пабачым, - Сказаў Белавус да прышэльца: - А потым і месца прызначым, Калі ты ад чыстага сэрца. Мы кожнаму помсніку рады*… (Я. Колас).

Некаторыя словы ўжываюцца са значэннем, якое яны мелі раней (да 30-х гадоў XX ст.), напрыклад *кахаць* - адчуваць глыбокую адданасць, прыхільнасць да чаго-н., быць адданым чаму-н.; любіць: *Кахаць дзяўчыну, хлопца - і кахаць радзіму, кахаць культуру, да якой належыш, цераз каханне ісці да каранёў сваіх, свайго роду і свайго народа, сваёй бацькаўшчыны. Вось асноўная ідэя рамана "Нельга забыць"* (У. Калеснік).

Як адзначаецца ў анатацыі, Слоўнік можа выкарыстоўвацца ў сярэдняй і вышэйшай школе, а таксама як даведнік для журналістаў, пісьменнікаў і рэдактараў. Няма сумневу, што ён будзе карысным пры выкладанні ў ВНУ стылістыкі і культуры маўлення, а таксама спецкурса па словаўтварэнні.

Васіль Рагаўцоў.